# ФАРМІРАВАННЕ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ НАВУЧЭНЦАЎ НА ЗАНЯТКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

А. М. АЛЬШЭЎСКАЯ
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфрматыкі і радыёэлектронікі*
*філіял "Мінскі радыётэхнічны каледж"*

**Анатацыя.** Глабальныя змены, якія адбываюцца ва ўсіх сферах нашага жыцця, ставяць перад сферай адукацыі новыя мэты - выхаванне свабоднай асобы, здольнай да актыўнай, творчай дзейнасці, гатовай да супрацоўніцтва і працы ў камандзе ў ролі лідара і ўдзельніка, здольнай дамаўляцца і нівеліраваць канфлікты з улікам розных пунктаў гледжання. Выхаванню такіх якасцей асобы садзейнічае фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі. У дадзеным артыкуле разглядаюцца метады і прыёмы фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў на занятках беларускай мовы і літарауры.

Камунікацыя ў сучасным грамадстве становіцца важным механізмам сацыяльнага фарміравання асобы. У яе працэсе адбываецца абмен інфармацыяй, наладжваецца суразмоўніцтва паміж людзьмі. Валоданне камунікатыўнымі навыкамі складае неабходны кампанент адукаванасці чалавека і з'яўляецца паказчыкам яго агульнай культуры.

Вельмі актуальнай праблемай, з якой сутыкаюцца сучасныя падлеткі, педагогі і псіхолагі лічаць нізкі ўзровень камунікатыўнай кампетэнтнасці, што прыводзіць да росту канфліктаў у дзіцячых калектывах, павышэння сацыяльнай трывожнасці дзяцей, няўмення і нежадання працаваць у групе, дамаўляцца, улічваць і паважаць іншую думку, а таксама дакладна і даступна выказваць уласную. Гэта істотна зніжае канкурэнтаздольнасць будучых прафесіяналаў на сучасным рынку працы, бо адной з галоўных якасцей супрацоўнікаў лічыцца ўменне крытычна мысліць, крэатыўна рашаць задачы, атрымліваць новыя веды, засвойваць інавацыйныя падыходы, эфектыўна працаваць у камандзе.

Таму адной з прыярытэтных задач адукацыі становіцца фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў. Камунікатыўная кампетэнцыя звязана з авалоданнем відамі маўленчай дзейнасці (чытанне, слуханне, гаварэнне, пісьмо) і асновамі культуры вуснага і пісьмовага маўлення, уменнямі і навыкамі выкарыстання мовы ў розных сферах і сітуацыях зносін.

На занятках беларускай мовы і літаратуры пры атрыманні сярэднеспецыяльнай адукацыі развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі адбываецца за кошт удакладнення і пашырэння відаў лінгвамаўленчай дзейнасці, якія рэалізуюць практыкаарыентаваны характар моўнай адукацыі: складанне плана, тэзісаў і канспекта вучэбнага тэксту, падрыхтоўка рэферата, даклада, напісанне анатацыі, рэцэнзіі, мэтанакіраваныя выпіскі, аналітычнае паведамленне на аснове самастойнага вывучэння тэксту (па плане, прапанаваным настаўнікам, а затым па ўласным плане), творчыя працы ў жанры эсэ, нарыса, апавядання і інш.

На занятках беларускай мовы я выкарыстоўваю разнастайныя віды работы з тэкстамі: аналіз розных відаў тэкстаў (публіцыстычных, мастацкіх, навуковых);

вызначэнне структурных асаблівасцей сказаў; рэдагаванне і пераўтварэнне сказаў; стварэнне ўласных тэкстаў з улікам моўных норм і стылю; чытанне, разуменне і пераказ тэксту; пераклад тэксту з рускай мовы на беларускую і наадварот; напісанне афіцыйнага ліста або дзелавога паведамлення; стварэнне рэкламнага тэксту або прэзентацыі; распрацоўка аргументаванага водгуку або аналітычнага артыкула.

На мой погляд, эфектыўнымі з'яўляюцца прыёмы так званага сэнсавага чытання: "Тэкст з памылкамі", "Тэкст з прабеламі", "Тэкст з малюнкамі", "Чытанне наадварот", "Чытанне да гары нагамі", "Перамешаныя літары", "Чытанне з паловамі слоў", "Суцэльны тэкст" і іншыя.

Што датычыцца заняткаў беларускай літаратуры, то на іх камунікатыўныя ўменні навучэнцаў праяўляюцца пастаянна. Мэта выкладчыка прапанаваць вучням цікавыя заданні, якія выходзяць за межы банальнага пераказу зместу твора і адказаў на пытанні. На сваіх занятках я выкарыстоўваю наступныя метады і прыёмы:

"Воблака слоў". Гэта спіс слоў, якія часцей за ўсё сустракаюцца ў тэксце. Спіс афармляецца наглядна, у якой-небудзь форме (напрыклад, воблака, дрэва, прамавугольніка і г.д.). У такім воблаку можна зашыфраваць словы любімага верша ці песні, таксама воблакам можна аформіць спіс слоў-асацыяцый.

"Інтэлект-карта". Гэта схема візуальнага прадстаўлення інфармацыі, якая адлюстроўвае сувязь паміж некалькімі яе элементамі. Структура карты знашне нагадвае дрэва: у цэнтры размяшчаюць асноўную ідэю, тэму або праблему, а ад яе разводзяць галіны – звязаныя ідэі і канцэпцыі. Інтэлект-карты вельмі прыдатныя для групавой формы работы.

"Відэакліп". Такое заданне можна прапанаваць замест вывучэння верша на памяць: навучэнец падбірае ілюстрацыі, відэа па тэме верша, наклдвае музыку, а сам за кадрам выразна чытае верш.

"Інтэрв'ю з пісьменнікам (дзеючай асобай твора)". Навучэнцам прапануецца прыдумаць 10 пытанняў для пісьменніка або героя вывучаемага твора. На занятках вучні ў парах агучваюць пытанні і даюць на іх адказы. Для выканання гэтага задання неабходна добра валодаць звесткамі аб жыцці і творчасці пісьменніка, а таксама дасканла ведаць змест твора.

"Гексы". Гэта шасцівугольнікі (часцей, у выглядзе сотаў), у якіх прадстаўлены веды па пэўным аспекце. Кожны з шасцівугольнікаў далучаецца да другога дзякуючы паняційным сувязям. Гексы могуць быць намаляваны ў сшытку або зроблены з паперы. Пры дапамозе гексаў можна скласці стужку часу або зрабіць іх поўнасцю ілюстраванымі.

"Буктрэйлер". Гэта кароткі відэаролік , які ў адвольнай мастацкай форме распавядае пра якую-небудзь кнігу або літаратурны твор. Галоўная задача буктрэйлера - зацікавіць і здзівіць будучага чытача, прыцягнуць увагу да сюжэтнай лініі і герояў мастацкага твора. Пры стварэнні буктрэйлера можна выкарыстойваць відэа, ілюстрацыі, фотаздымкі, вокладкі кніг.

«Інсэрт». Гэты метад дазваляе навучэнцам адсочваць сваё разуменне прачытанага задання або тэксту. Тэхнічна ён вельмі просты. Навучэнцаў неабходна пазнаёміць з маркіровачнымі знакамі і прапанаваць ім па меры

чытання ставіць іх алоўкам на палях падручніка або спецыяльна падрыхтаванага тэкста . Паметы павінны быць наступныя: + ведаю; – не ведаю; ? хачу даведацца больш падрабязна; ! даведаўся новае. Метад вымушае навучэнца не проста чытаць, а ўчытвацца ў заданне, у тэкст, адсочваць уласнае разуменне ў працэсе чытання.

“Фішбоўн”. Універсальны прыём, якім можна карыстацца на занятках любога тыпу, але найбольш эфектыўны ён на занятках абагульнення і сістэматызацыі ведаў, каб дапамагчы навучэнцам арганізаваць атрыманую інфармацыю ў стройную сістэму. У яго аснове - схематычная дыяграма ў форме рыбінага шкілета. Гэты прыём дазваляе навучэнцам прааналізаваць увесь вучэбны матэрыял, які быў прапанаваны пры вывучэнні тэмы, і зрабіць адпаведныя высновы.

“Алфавіт”. Вучням прапануецца на кожную літару алфавіта падабраць словы, якія адпавядаюць вывучаемай тэме. Гэты прыём добра зарэкамендаваў сябе пры вывучэнні біяграфій пісьменнікаў.

Зразумела, што сфарміраваць камунікатыўную кампетэнцыю навучэнцаў за некалькі заняткаў немагчыма. Гэта вельмі складаны і працяглы працэс. Таму толькі сістэматычнае выкарыстанне падобных метадаў і прыёмаў вывучэння беларускай мовы і літаратуры стварае магчымасць фарміравання і развіцця камунікатыўнай кампетэнцыі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Беларуская мова. 10 клас. Дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы (базавы і павышаны узроуні) : дапам. для настаїнікаї установї агул. сярэдняй адукацi з белар. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. М. Якуба. – Мазыр : Выснова, 2021. – 128 с. – (Кампетэнтнасны падыход).

2. Фарміраванне функцыянальнай граматнасці навучэнцаў сродкамі вучэбнага прадмета «Беларуская мова» : артыкул / Ю.В. Ждановіч. – Нясвіж : Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Затур’янская сярэдняя школа», 2024. – 4 с. – Режим доступа: https://xn--80an2ahf9cva.xn----8sbafcoeer1c5bfp.xn--90ais/files/00298/obj/140/148713/doc/%D1%81%D1%82%D0%B0%D1%82%D1%8C%D1%8F-%D0%96%D0%B4%D0%B0%D0%BD%D0%BE%D0%B2%D1%96%D1%87.pdf. – Дата доступа:10.05.2025

3. Развіццё камунікатыўнай культуры вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры» : артыкул / І.М. Баравік. – Мар'іна Горка : Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа №2 г.Мар'іна Горка», 2018. – 35 с. – Режим доступа: https://infourok.ru/razviccyo-kamunikatinay-kulturi-vuchnya-na-rokah-belaruskay-movi-i-litaraturi-2551494.html. -Дата доступа: 10.05.2025.